УДК 394.3-053.2(476)

# Традыцыйныя дзіцячыя гульні беларусаў (на матэрыялах другой паловы XIX – пачатку XX ст.)

Якубінская А. Дз.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Традыцыйна адным з важнейшых фактараў уключэння дзіцяці ў грамадства з’яўляецца яго гульнявая культура, якая фарміруецца пад уплывам вопыту папярэдніх пакаленняў і вопыту аднагодкаў і носіць пазнавальны, адаптацыйны і выхаваўчы характар. У беларускай вёсцы не існавала аднаўзроставых груповак, што было звязана з дзейнасцю такога спецыфічнага сродка культуры, як “інстытут мацярынства”, адной з праяваў якога быў абавязак шасці-васьмігадовай “нянькі” даглядаць малодшых братоў ці сясцёр. Гульня складалася з двух асноўных кампанентаў: жэрабя або лічылкі і ўласна гульні. Жэрабя або лічылка заўсёды насіла нарматыўны, заканадаўчы характар у дзіцячай суполцы і падкрэслівала справядлівасць вынікаў гульні. Лічэнне адбывалася адпаведна прынятай славеснай формуле і магло суправаджацца сімвалічным або канкрэтным пакараннем: сцябанне пруцікам, цяганне за вушы, штуршкі. Наступным кампанентамам гульнявой дзейнасці дзяцей была ўласна гульня, якая з’яўляецца часткай сацыянарматыўнай культуры. Імітацыйныя гульні (гульні, у якіх дзеці імітуюць паводзіны, заняткі, працу, адносіны дарослых) былі важным спосабам узнаўлення вопыту папярэдніх пакаленняў, засваення традыцыйных каштоўнасцей. Яны суправаджаюцца ўключэннем творчых здольнасцяў дзіцяці, накіраваных на спробу спраектаваць пэўную сацыяльную ролю на сябе. Развіццё імітацыйных гульняў адбывалася ад прасцейшых рэфлекторных імітацый рухаў і гукаў да складанай імітацыі дзейнасці дарослых у сям’і і грамадстве. Спробы дзяцей адпаведнага полу ў працэсе гульні спраектаваць на сябе пэўную сацыяльную ролю мужчыны ці жанчыны прыводзілі да фарміравання адпаведнай адаптацыйнай стратэгіі. З аднаго боку, дзейнасць такіх спецыфічных сродкаў культуры, як “інстытут мацярынства” і “інстытут пастухоўства”, вызначала характар гульні: імітацыйныя рысы гульні пераважалі ў дзявочым калектыве, а спартыўна-спаборніцкія – у хлапечым. З другога боку, сумесныя гульні маглі мець і спартыўна-спаборніцкі характар, і элементы імітацыі адначасова. Яны з’яўляліся адлюстраваннем сістэмы грамадскіх і сацыяльных адносін, пазітыўнага і негатыўнага вопыту папярэдніх пакаленняў, характару адносінаў да этнічных груп Беларусі, што прыводзіла да фарміравання адпаведных стэрэатыпаў паводзінаў.